8. Навуменка, І. Суладдзе са светам прыроды : Адухоўленасць прыроды ў паэзіі Максіма Багдановіча / І. Навуменка // Роднае слова. – 1998. – № 1. – С. 26–39.
9. Навуменка, І. “ Як зрабілася , што пакахаў цябе я ... " : Жаночыя вобразы ў творчасці Максіма Багдановіча / І. Навуменка // Роднае слова. – 1997. – № 11. – С. 30–43.

## ГАДОНІМЫ СЛОНІМА (ЛЕКСІКА-СЕМАНТЫЧНАЯ І СТРУКТУРНА-ГРАМАТЫЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА, АСАБЛІВАСЦІ ЎЖЫВАННЯ)

**Кемяжук Г.В.,**
студэнтка 1 курса лячэбнага факультэта

УА “Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт”
Кафедра рускай і беларускай моў
Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Варанец В.І.

Рэпозиторий ГрГМУ

Гіпотэза: сярод імёнаў славутых беларускіх дзеячаў можна вылучыць тыя, якія маюць непасрэднае дачыненне да Слонімшчыны і могуць быць выкарыстаны ў якасці назваў вуліц і завулкаў горада.

Мэта: на падставе аналізу гадонімаў Слоніма, гісторыка-літаратурнай і культурнай спадчыны горада скласці спіс імёнаў славутых дзеячаў для назваў новых вуліц і завулкаў горада.

Задачы:

- вызначыць лексіка-семантычныя і структурна-граматычныя асаблівасці гадонімаў Слоніма;
- раскрыць тэндэнцыі назваўтварэння;
- выявіць гаданімічныя магчымасці імёнаў славутых беларускіх дзеячаў, звязаных з гісторыяй Слонімшчыны;
- прапанаваць спіс імёнаў беларускіх дзеячаў для назваў вуліц і завулкаў горада Слоніма.

Аб’ект даследавання: назвы вуліц, гісторыка-літаратурная спадчына горада Слоніма.

Прадмет даследавання: гаданімічныя магчымасці гісторыка-літаратурнай і культурнай спадчыны горада Слоніма.

Метады даследавання: інтэрв’ю, вывучэнне тэарэтычных асноў, аналіз, картаграфічны метад, статыстычны метад, сінтэз, экскурсія, гутарка.

Гадонімы (ад грэч. hodos ‘вуліца’ і onyma ‘імя’) – назвы лінейных аб’ектаў гарадоў: вуліц, завулкаў, бульвараў, праспектаў, пераездаў, набярэжных (вуліца Адама Міцкевіча, завулак Доўгі, праспект Незалежнасці)

Мы прааналізавалі 267 назваў вуліц і завулкаў.

Паводле значэння ўтваральных асноў гадонімы складаюць дзве асноўныя групы: адапелятыўныя і аданамастычныя. Сярод адапелятыўных утварэнняў мы вылучылі 17 семантычных падгруп, сярод аданамастычных – 12.

Па структуры гадонімы падзяляюцца на аднаслоўныя і шматслоўныя.

Паводле часцінамоўнай афармленасці аднаслоўныя назвы выражаюцца: прыметнікамі – 121 найменне і назоўнікамі – 81 найменне.

Сярод гадонімаў-прыметнікаў вылучаюцца: вытворныя простыя (112 найменняў), утвораныя пераважна суфіксальным і прыставачна-суфіксальным спосабамі ўтварэння – *вул. Азёрная, вул. Баранавіцкая, вул. Заазёрная*; складаныя (2 найменні), утвораныя складана-суфіксальным спосабам – *вул. Чырвонаармейская, вул. Першамайская;* невытворныя (7 найменняў) – *вул. Вясёлая. завул. Доўгі, вул. Зялёная.*

У гадонімах-назоўніках (81 найменне) у ролі асноўнага кампанента выступаюць:

- псеўданімы, прозвішчы ў форме Р. склону адз. ліку (58 найменняў) – *вул. Агінскага, завул. Багдановіча;*

- агульныя назоўнікі ў форме Р. склону адз. ліку (9 найменняў) – *завул. Будучыні, завул. Дружбы;*

- назоўнікі ў форме Р. склону мн. ліку (10 найменняў) – *вул. Будаўнікоў, вул. Дзекабрыстаў, вул. Касманаўтаў.*

Тры гадонімы-назоўнікі ўтвораны шляхам трансанімізацыі (*вул. Панасоўка, завул. Панасоўка, завул. Скубішоўка)* і адна назва ўтворана марфемным (нульсуфіксальным) спосабам утварэння – *завул. Пераскок.*

Шматслоўныя гадонімы складаюць 65 найменняў. Сярод іх вылучаюцца: двухкампанентныя (63 назвы) і трохкампанентныя (2 назвы).

Двухкампанентныя гадонімы складаюцца са слоў, якія звязваюцца паміж сабой сінтаксічным спосабам:

- імя + прозвішча ў форме Р. склону (25 найменняў) – *вул. Юрыя Гагарына, вул. Янкі Купалы;*

- парадкавы лічэбнік + прыметнік у форме Н.склону (21 найменне) – *завул. 1-ы Нагорны, завул. 2-гі Нагорны;*

- лічэбнік + назоўнік у форме Н. склону (7 найменняў) – *вул. 1-ы Пераезд, вул. 2-гі Пераезд***;**

- прыметнік + назоўнік у форме Р. склону (4 найменні) – *вул.Чырвоных Партызан, вул. Савецкіх Пагранічнікаў;*

- прыметнік + назоўнік у форме Н. склону (3 найменні) – *вул. Косаўскі тракт;*

- лічэбнік + назоўнік у форме Р. склону (3 найменні) – *вул.8 Сакавіка;*

Сярод трохкампанентных найменняў вылучаецца два гадонімы, пабудаваныя па мадэлі лічэбнік + назоўнік + назоўнік (*вул. 50 год ВЛКСМ, вул. 70 год Кастрычніка).*

Такім чынам, можна сцвярджаць, што сучасным гаданімічным тэндэнцыям уласцівы наступныя асаблівасці:

Паводле структуры пераважаюць аднаслоўныя назвы.

• Назвы вуліц маюць абавязковыя кампаненты. У якасці кампанентаў часцей выкарыстоўваюцца геаграфічныя тэрміны *вуліца і завулак,* якія звычайна

Рэпазіторый ГрГМУ

знаходзяцца перад назвай. У некаторых выпадках яны ўключаюцца ў склад назвы, змяняючы пры гэтым яе структуру (вул.Косаўскі тракт).

- Аднаслоўныя гадонімы выражаюцца прыметнікамі і назоўнікамі.
- Сярод гадонімаў-прыметнікаў пераважаюць вытворныя простыя назвы, утвораныя суфіксальным спосабам.
- Найбольш шырока прадстаўлены гадонімы-прыметнікі, якія атрымалі сваю назву ў сувязі з тым, што яны размешчаны ў накірунку да асобных населеных пунктаў, названыя па асаблівасцях і месцы размяшчэння аб’ектаў, матываваныя назвамі флоры і асаблівасцямі ландшафту, звязаныя з назвамі аб’ектаў, устаноў, што размяшчаліся ці размяшчаюцца на вуліцах або блізка каля іх, а таксама гадонімы, названыя ў гонар сімвалаў савецкай эпохі;
- Гадонімы-назоўнікі ўтвораны пераважна па матыве “ў гонар знакамітых людзей”. У ролі назоўнікаў ужыты псеўданімы, прозвішчы без імёнаў.
- Сярод гадонімаў-назоўнікаў найбольш шырока прадстаўлены тыя назвы, якія носяць імёны вайскоўцаў, герояў Вялікай Айчыннай вайны, названыя ў гонар рэвалюцыянераў, савецкіх партыйных дзеячаў, а таксама ў гонар рускіх пісьменнікаў і паэтаў.
- З 83 вуліц і завулкаў, назвы якіх утвораны па матыве “ў гонар знакамітых асоб”, толькі 34 названы імёнамі людзей, што маюць дачыненне да Слоніма, а вуліц, якія атрымалі найменні ў гонар дзеячаў беларускай літаратуры і культуры, увогуле нямнога – 12.
- Мы звярнуліся да кніг, у якіх адлюстравана гісторыя Беларусі і Слонімшчыны, наведалі раённы краязнаўчы музей імя І. І. Стаброўскага і прыйшлі да высновы, што ў якасці назваў новых вуліц горада Слоніма можна прапанаваць імёны славутых беларускіх дзеячаў, гістарычных асоб, чыя дзейнасць была звязяна з жыццём Слонімшчыны.

Прапануем у якасці назваў вуліц горада Слоніма выкарыстаць імёны славутых дзеячаў Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай –князя Васількі, князя Вітаўта, Сымона Буднага, ІванаМялешкі, Крыштофа Завішы, Францішка Хамінскага, Войцеха Пуслоўскага; прадстаўнікоў нацыянальна-вызваленчага руху на Беларусі – Міхаіла Валовіча, Кастуся Каліноўскага; класікаў беларускай літаратуры – Уладзіміра Караткевіча, Янкі Брыля; слонімскіх пісьменнікаў і паэтаў – Кандрата Лейкі, Гальяша Леўчыка,Сяргея Дарожнага,Анатоля Іверса, Якуба Міско, Рудольфа Пастухова, Алега Лойкі, Янкі Саламевіча;вядомых людзей ў галіне медыцыны – Вікенція Герберскага, Венцаслава Пелікана,Андрэя Пракапчука; гісторыкаў – Язэпа Стаброўскага, Аляксандра Жукоўскага; вядомых дзеячаў ў галіне культуры – Антона Карніцкага, Антона Валынчыка, Мікалая Варвашэвіча.

Такім чынам, мы прапанавалі 27 назваў для новых вуліц і завулкаў Слоніма. Асноўная вартасць нашай працы – гэта указанне крыніцы і шляху запазычанняў.



Репозиторий ГрГМУ